Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 13 (255) | Субота, 14 красавіка 1956 года. | Цана 20 кап.

## ЯНЫ АБАРАНІЛІ ДЫСЕРТАЦЫІ

В. Хацкевіч у 1947 годзе закончыла Барысаўскае педагагічнае вучылішча і паступіла на першы курс БДУ імя І. В. Леніна. Аднachасова яна працуе педагогам у вячэрняй школе рабочай моладзі № 1 горада Мінска. Цяжка было вучыцца і працаваць. Але Вера Барысаўна перамагла цяжкасці і ў 1952 годзе паспяхова закончыла універсітэт.

Потым паступіла ў аспірантуру, якую і закончыла ў 1955 г.

10 красавіка 1955 г. Вера Барысаўна Хацкевіч абараніла дысертацыю на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук. Яна распрацавала ў сваей дысертацыі тэму аб суфіксальным словаўтварэнні назоўнікаў (суфіксы асобы) у сучаснай беларускай мове. Гэтая тэма мала распрацавана ў нашым мовазнаўстве. Як адзначылі афіцыяльныя апаненты А. Я. Бірала, Б. І. Касоўскі і Л. М. Шакун, работа маладога вучонага мае вялікае практычнае значэнне ў справе нармалізацыі некаторага разнабою, які існуе ў мове.



**І. СІПАКОЎ.**

* * *

Пасля заканчэння ў 1951 г. універсітэта па рэкамендацыі вучонага совета В. П. Кадзюкова паступіла ў аспірантуру на кафедру глебазнаўства. Многа і настойліва працавала яна над абранай тэмай.

Днямі на вучоным совеце адбылася абарона дысертацыі В. П. Кадзюковай на тэму «Мікрафлора глебаў вопытнай станцыі «Бараўляны» АН БССР і яе змяненні ва ўмовах акультывавання».

Праца прысвечана вывучэнню мікробнага насялення дзярнова-падзолістых глебаў, устанаўленню залежнасці яго (мікранасялення) ад умоў акружаючага асяроддзя да вывучэння дынамікі мікраарганізмаў у час вегетацыйнага перыяду. У выніку даследавання аўтарам дысертацыі ўстаноўлена, што рознастайнасць флоры даследаваных глебаў вялікая. Мікраарганізмы размешчаны ў глебе няроўнамерна. Асноўная частка іх знаходзіцца ў ворыўным гарызонце. З паглыбленнем агульная колькасць мікробаў памяншаецца. Змяняюцца суадносіны груп.

Работа маладога вучонага, як адзначана на вучоным совеце, мае практычнае значэнне для сельскагаспадарчых раёнаў.

**Ю. НІКАЛАЕЎ.**

## Адказы—змястоўныя

Да пачатку экзамена заставалася яшчэ з паўгадзіны. Фадзей Савіцкі моўчкі пахаджваў па калідоры і ўвесь час прагна курыў, а Толя Стаўроў і Нікалай Чайка стаялі каля акна і ў апошні раз праглядалі канспект.

— Хопіць ужо, хлопцы,—сказаў Фадзей, падышоўшы да іх,—бо будзеце залішне многа ведаць.

— Дзе тут залішне. Хоць-бы ведаць тое, што трэба. Здаецца, прачытаў усё, а неяк страшнавата крыху,—прамовіў Толя.

Стрэлка гадзінніка ўпарта прыбліжалася да дзевяці. Хлопцы ужо не чыталі канспект, а моўчкі глядзелі ў акно, любуючыся прыгожай вясенняй раніцай, і крыху хваляваліся.

... Добра, адказваў Фадзей Савіцкі. Ён дэталёва, упэўнена расказваў аб тыпах словазлучэнняў, аб выкарыстанні архаізмаў у сучаснай рускай літаратурнай мове, паказаў добрыя веды ў разборы сказаў. І старшы выкладчык Іван Антонавіч Карабань ставіць у яго заліковую кніжку «выдатна».

А ў гэты час пад дзвярыма стаялі яго аднакурснікі. І як толькі Фадзей вышаў з аўдыторыі, яго адразу акружылі студэнты, пачалі наперабой сыпаць пытанні, заглядаць у заліковую кніжку...

Студэнты 2 курса аддзялення журналістыкі добра падрыхтаваліся да экзамена па сучаснай рускай літаратурнай мове. 22 студэнты атрымалі выдатныя адзнакі. Асабліва добрыя веды паказалі Васіль Зуёнак, Слава Гурэвіч, Наташа Кавалёва, Алег Сцепаненка, Тамара Карцава, Фадзей Савіцкі і інш.

Ніжэй сваіх магчымасцей здалі экзамен Барыс Фралоў, які атрымаў «нездавальняюча», і Таня Булгакова, якая адказала на «здавальняюча».

Праўда, у працэсе падрыхтоўкі да экзамена былі і некаторыя цяжкасці. Справа ў тым, што нехапала неабходнай літаратуры, і студэнтам прыходзілася ездзіць па ўсіх бібліятэках, г. Мінска, каб знайсці той ці іншы падручнік. Кафедры рускай мовы трэба паклапаціцца аб тым, каб набыць у дастатковай колькасці хоць-бы самыя неабходныя падручнікі на рускай мове.

**В. СКАПА.**

## Вывучаюць матэрыялы XX з'езда КПСС

Кафедры грамадскіх навук і гісторыі СССР сур'ёзна аднесліся да падрыхтоўкі і правядзення лекцый і семінараў па вывучэнню матэрыялаў XX з'езда КПСС.

Дацэнтамі Саладковым, Панкратавым і Мальцавым прачытана на гістарычным факультэце 4 лекцыі. Трэба адзначыць высокаідэйны і тэарэтычны ўзровень лекцый дацэнтаў Мальцава і Панкратава. На ўсіх курсах гістарычнага факультэта ўжо было па два семінары. Практычныя заняткі праходзяць цікава і пры вялікай актыўнасці студэнтаў. Вычарпальныя адказы даюць студэнты 5 і 4 курсаў, дзе семінары вядуць дацэнты Баранава і Фрыдман.

**Ю. СВІРКО.**

## ВЕЧАР ДРУЖБЫ

Незадоўга да вечара, які арганізавалі студэнты-першакурснікі аддзяленняў журналістыкі і матэматыкі, Ала Чарнякова гаварыла аднакурснікам:

—Столькі работы, што не ведаеш нават, за што брацца.

І сапраўды, работы было многа. Гэта-ж, можна сказаць, пачатак толькі, выяўленне здольнасцей кожнага. Першы вечар, які арганізоўваецца сваімі сіламі. І як не хвалявацца ў такіх выпадках?

Хацелася і праграму зрабіць, як мага лепшай, і добрыя, цікавыя атракцыёны. У гэтым ёй дапамагаў Пётр Казачонак, ды і ўсе аднакурснікі.

І вось вечар, доўгачаканы і радасны, прышоў са сваімі хваляваннямі, весялосцю. Журналісты з цікавасцю слухаюць, як выконвае песні Нэла Хаджаева, а матэматыкі захапляюцца мастацкім чытаннем Віктара Дашука, уласнымі байкамі Ігара Рудамётава. А які добры голас у Лілі Сувораваі!

Не ведалі раней аднакурснікі, што Іван Пехцераў і Леанід Лукашонак могуць выступаць у якасці канферансье. А ў іх атрымалася нядрэнна, хоць, праўда, з некаторымі хібамі.

Потым атракцыёны, танцы. Цікава прайшоў гэты вечар дружбы і выяўлення талентаў.

**Я. ГОМАН.**

## ЖАДАНЫЯ ГОСЦІ

На біёлага-глебавым факультэце адбылася нядаўна сустрэча з выпускнікамі. У госці да сваіх ранейшых педагогаў, а таксама да тых, хто заняў зараз іх месца ва універсітэце, прышлі вучоныя, выкладчыкі ВНУ, настаўнікі сельскіх і гарадскіх школ, якія ў розны час атрымалі дыпломы, прафесію.

У 1949 годзе закончылі універсітэт Елена Сяргееўна Акушэвіч і Леакадзія Георгіеўна Сімановіч. Зараз Елена Сяргееўна працуе выкладчыкам Бабруйскага педвучылішча, а Леакадзія Георгіеўна—асістэнт кафедры батанікі Беларускай сельскагаспадарчай Акадэміі.

Восем год таму назад закончыў універсітэт Аляксандр Андрэеевіч Хадзінскі, які працуе зараз выкладчыкам сельскай школы.

Цёпла сустрэлі студэнты іх цікавыя выступленні, з вялікай увагай слухалі расказ аб іх вучобе, рабоце.

**С. ІВАНОЎ.**

## СУСТРЭЧА студэнтаў з сястрой і сябрам В. Маякоўскага

Вестка аб прадстаячай сустрэчы з сястрой таленавіцейшага паэта В. В. Маякоўскага Людмілай Уладзіміраўнай і былым таварышам, арганізатарам шматлікіх выступленняў паэта ў розных гарадах Совецкага Саюза Паўлам Ільічом Лавутам хутка абляцела ўсе факультэты універсітэта. Кожны студэнт чытае і захапляецца патрыятычнымі, няўміручымі творамі В. В. Маякоўскага, але паслухаць, што скажуць блізкія паэту-трыбуну людзі, кожнаму цікава. І яшчэ задоўга да прыходу Людмілы Уладзіміраўны і Паўла Ільіча самая вялікая аўдыторыя біякорпуса была перапоўнена студэнтамі і выкладчыкамі ўсіх курсаў і факультэтаў. Жадаючых паслухаць набралася столькі, што аўдыторыя не ўмясціла ўсіх—і студэнты стаялі ў праходах, дзвярах, калідорах...

Лавут расказвае, як паэт, ходзячы па вуліцах гарадоў, седзячы ў вагоне і размаўляючы з чалавекам, складаў радкі вершаў. Паэт быў вельмі чулы да акружаючых яго, заўсёды да сваіх твораў быў прыдзірлівы і патрабавальны. Шмат клопатаў ён праяўляў і аб літаратурнай змене—маладых літаратарах. Творы пісаў на актуальныя тэмы сапраўднасці, кожны яго твор страляў у ворага.

П. І. Лавут прывёў некалькі цікавых эпізодаў з жыцця паэта, якія паказваюць, што ён і ў жыцці быў такім мужным, смелым патрыётам, як і ў паэзіі. Сам П. Лавут—акцёр, і ён па-майстэрску суправаджаў сваё выступленне чытаннем урыўкаў з твораў паэта.

Людміла Уладзіміраўна расказала шмат цікавых эпізодаў з жыцця малога Валодзі—будучага паэта. Спынілася яна і на сапраўдных сувязях Маякоўскага з футурыстамі. У гэтым пытанні, як і ў іншых, якія адносяцца да творчасці паэта, ёсць шмат блытаніны, якую ўносілі ў разгляд творчасці паэта яго ворагі. Людміла Уладзіміраўна расказала аб пераходзе Маякоўскага на бок рэвалюцыі, аб рабоце паэта ў рэвалюцыйных арганізацыях, яго сувязях з рэвалюцыйна настроенай часткай рабочых і студэнтаў, аб гадах, праведзеных у турме.

Людміла Уладзіміраўна нядаўна закончыла кнігу ўспамінаў аб брату. З некаторымі раздзеламі кнігі яна пазнаёміла прысутных. Першы экземпляр гэтай кнігі, якая неўзабаве выйдзе асобным выданнем, сястра вялікага паэта паабяцала прыслаць у наш універсітэт. Яна адказала на рад пытанняў, якія задалі студэнты і выкладчыкі.



З уступным словам выступіў І. В. Гутараў. Ён прадставіў прысутным дарагіх гасцей, падзякаваў ім за тое, што наведалі наш універсітэт.

П. І. Лавут, які быў сустрэты прысутнымі з сардэчнай цеплынёй, расказаў аб паездках паэта па гарадах нашай краіны, аб яго сустрэчах і размовах з чытачамі. З цікавасцю слухалі студэнты аб фактах і падзеях у жыцці вялікага нашага сучасніка. Уладзімір Маякоўскі надаваў вялікае значэнне сустрэчам з чытачамі. Аб гэтым гаворыць тое, што ён склаў пяцігадовы план паездак па гарадах краіны. В. Маякоўскі бывала ў адзін дзень выступаў у 2—3 месцах, кожная сустрэча праходзіла бурна, цікава, бо паэт не выступаў, а размаўляў з чытачамі. Не дзіўна, што кожная такая сустрэча працягвалася па 3—4 гадзіны. Нягледзячы на цяжкасці сустрэч, частых пераездаў, паэт стараўся шмат пісаць. Для Маякоўскага не патрэбны быў асобны пакой для творчасці, цішыня, ён тварыў усюды і заўсёды.

У заключэнне сустрэчы студэнты і выкладчыкі праслухалі некаторыя творы ў выкананні Маякоўскага, запісаныя на плёнку.

**Б. ЧОРНЫ.**



НА ЗДЫМКАХ: зверху—Л. В. Маякоўская, І. В. Гутараў і Я. Бабосаў абменьваюцца думкамі аб творах паэта, унізе—Л. В. Маякоўская і П. І. Лавут сярод студэнтаў, выкладчыкаў і аспірантаў універсітэта.

# ЗАЛІКОВАЯ КНІЖКА БАРЫСА ГУРСКАГА

Засталіся ззаду 10 школьных год... Перад Барысам Гурскім паустала пытанне: па якой дарозе ісці далей, якую выбраць прафесію? Шмат шляхоў вяло ў жыццё, і юнак цвёрда не ведаў, якому з іх аддаць перавагу, які зрабіць сваім.

Адна мара змяняла другую... Дапамагла сустрэча са старэйшым сябрам Селіванавым, які раней скончыў тую-ж 44-ю школу і паступіў на аддзяленне геалогіі БДУ імя Леніна.

— Паступай да нас, Барыс,—прапанаваў ён.—Не пашкадуеш.

Ен доўга расказваў аб факультэце, аб сваіх таварышах-аднакурсніках.

Барыс здаў уступныя экзамены і быў залічан студэнтам геолага-геаграфічнага факультэта.

Ен, як і іншыя, атрымаў цёмназялёную кніжачку са срэбным надпісам «Заліковая кніжка».

— Жадаю, сябры, — сказаў дэкан факультэта першакурснікам,—каб у вашых заліковых кніжках, гэтых пастаянных сведчаннях поспехаў, былі толькі выдатныя і добрыя адзнакі.

— Пастараемся, — дружна адказалі Барыс і яго аднакурснікі.

З таго незабыўнага часу уступлення у студэнцкае жыццё прайшло амаль чатыры гады.

Калі-ж раскрыеш цяпер заліковую кніжку Гурскага, бачыш, што ён стрымаў сваё слова. На сямі запоўненых старонках кніжкі толькі адна добрая адзнака, усе астатнія—выдатныя.

Кароткая, але выразная мова адзнак сведчыць аб упартай і настойлівай рабоце юнака па авалоданню ведамі.

Барыс, пачынаючы з першых дзён заняткаў ва універсітэце, рэгулярна працуе над першакрыніцамі і падручнікамі, сістэматычна канспектуе лекцыі, заўсёды падрыхтаваным прыходзіць на семінарскія і практычныя заняткі.

У зімовую экзаменацыйную сесію студэнты 4 курса здавалі экзамен па курсу карысных выкапняў. Гэта адзін з асноўных прадметаў, якія чытаюцца на аддзяленні геалогіі.

Барыс доўга і старанна, на працягу усяго семестра, рыхтаваўся да гэтага экзамена. Добрасумленная праца, як і заўсёды, дала добрыя вынікі.

Выкладчык, кандыдат навук С. Г. Драмашка, засталася задаволенай поўнымі і вычарпальнымі адказамі Барыса Гурскага на яе пытанні. У заліковай кніжцы з'явілася яшчэ адна выдатная адзнака, яшчэ адно сведчанне перамогі.

Барыс Гурскі карыстаецца заслужаным аўтарытэтам сярод таварышаў. Ужо на першым курсе яго выбралі старастам. Цяпер ён—старшыня профбюро геолага-геаграфічнага факультэта. Шмат спраў у Барыса. Але актыўная гра-



мадская работа не перашкаджае яго асноўнай задачы—авалоданню ведамі.

Выдатным поспехам у вучобе дапамагае і практыка. Мінулым летам Барыс Гурскі з групай таварышаў удзельнічаў ва універсітэцкай экспедыцыі на Урал па збору узораў карысных выкапняў. Студэнты добра папрацавалі і прывезлі каля 50 тон узораў для музея і кабінета. Рэктар універсітэта аб'явіў чацверакурснікам падзяку.

Барыс добра ведае, што нашай краіне патрэбны высокакваліфікаваныя кадры. Выдатныя адзнакі у заліковай кніжцы—яго адказ на клопаты партыі і урада аб падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. І можна не сумнявацца, што на чыстых старонках, якія засталіся у заліковай кніжцы, таксама з'явяцца толькі выдатныя адзнакі.

**Т. БАНЬКОЎСКАЯ.**

# Універсітэцкі ВОЖЫК



## Горды Голуб



Студэнт 4-га курса аддзялення фізікі Е. Голуб пагардліва адносіцца да калектыва, прапускае лекцыі па матэрыялах XX з'езда КПСС. На справядлівыя папрокі аднакурснікаў ён адказвае: «Я лічу наведванне лекцый добраахвотнай справай. Але калі таварышы настойваюць, я магу хадзіць на заняткі».

Седзячы у прэзідыуме комсамольскага схода, ён чытае кнігу, не звяртаючы увагі на таварышаў.

* * *

Этот птичий человек
Так однажды гордо рек:
— Возведённый на активе
В отделенческий актив,
Представитель коллектива,
Я... плюю на коллектив!
И, в президиуме сидя,
Не отвел от книги глаз:
Пусть, мол, все студенты видят:
«Мне сегодня не до вас...»

Резюмируем пока:
Не валяй-ка дурака!

## АПОШНІЯ МОДЫ

Вы хочаце паглядзець навейшыя прычоскі? Калі ласка! Заглянiце на II курс аддзялення журналістыкі і II курс хімфака. Некаторыя з іх паказаны на гэтым малюнку.




У інтэрнат па вуліцы Няміга часта заходзяць незнаёмыя людзі ў нецвярозым выглядзе. Бывае, што яны адкрываюць нават бойку паміж собой.



Яны зайшлі сюды без перашкоды:
У кепках на вачах, з прычоскай моднай.
Яны, у дым п'яныя, ледзь на нагах
стаялі
І між сабою бойку распачалі.
А камендант са старшынёй студкома
Мірылі іх, прасілі йсці дадому...

А лепш за ўсё дзяжурства тут
наладзіць,
Тады мірыць не трэба будзе п'яніц.

# АГЛЯД МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ НА ФІЛФАКУ

Штогодныя агляды мастацкай самадзейнасці сталі традыцыяй ва універсітэце. На працягу усяго вучэбнага года факультэцкія калектывы рыхтуюць свае праграмы.

У гэтым годзе міжфакультэцкія агляд мастацкай самадзейнасці адкрыў філалагічны факультэт. Ен выступіў з вялікай і цікавай праграмай.

Хор выканаў «Кіеўскі вальс» Майбарады, песню Дунаеўскага «Не забывай». Танцавальны калектыў з поспехам выканаў народныя танцы «Малдаванэска», «Юрачка», «Маладзёжны танец» і іншыя.

Вельмі цёпла было сустрэта выступленне нашых польскіх студэнтаў, якія займаюцца на філфаку, Любы Філіпік, Веры Паўлоўскай, Шымана Раманчука. Яны выканалі польскую эстрадную песню «Вясёлы поезд» і песню «Новая Варшава» Гранштэйна.

Вялікім поспехам карысталіся спевакі і дэкламатары факультэта. Студэнтка II курса Тамара Пашкевіч прачытала «Першую паэму» Маргарыты Алігер і «Любоў сонца» С. Капуцікян. Два рамансы Глінкі — «Жаваранак» і «Венецыянская ноч» выканала Дзіна Пераверзева. Свае вершы прачыталі студэнты аддзялення журналістыкі А. Харкевіч і Г. Бураўкін.

Рашэннем камісіі агляду на заключны канцэрт факультэтаў адабрана звыш 20 нумароў.

**Н. БАНДАРЫН.**



НА ЗДЫМКУ: студэнткі III курса філфака Г. Давідчык і Т. Ярошка выконваюць украінскі «Маладзёжны танец».

**Фото Г. ПРАВАЛОВІЧА.**



## Расфранцуженной Аделине



*Не смущайтесь—*
*Вы прекрасны!*
*Восхищен!*
*Не скрыть греха...*
*Опасения напрасны?*
*Вы серьезно это? Ха!*

*Я о вас,*
*Не без сомненья,*
*Был чуть-чуть иного*
*мненья...*
*Ваши глазки—*
*Ну, не глазки,*
*Может,*
*А сияющие звезды,*
*Если бы не краски,*
*Свет их*
*В сердце кто-то нес бы...*
*Ваши щечки—*
*Ну, не щечки,*
*Ну, не щечки,*
*А... ланиты.*
*Жаль,*
*Не вами мушки-точки,*
*А природою забыты...*
*Ну, а косы!..*
*Где же косы?*
*Вместо них*
*(Не всем на диво),*
*Вверх крючечками вопросов*
*Взбудораженная грива...*
*Ну, а платье!.*
*Ну и платье*
*Ведь—*
*Матерчатая дудка,*
*Как в нее,*
*Хотел бы знать я,*
*Влазит «мода» не на шутку?*
*Как не лопнет*
*от натуги?*
*А-а-а... находчивы же вы.*
*Ведь у вас*
*И у подруги*
*Все разрезы,*
*Редко швы...*
*Вам на танцах скучновато?*
*Кто же с вами не смешон...*
*Погодите,*
*Вас подхватит*
*Обязательный пижон.*
*С вами он и отфокстротит*
*Вам стиляжиться не ново...*
*Жаль—*
*Слова одни не в моде,*
*Я бы вас*
*таким бы словом!.*
*Вы довольны, Аделина?*
*Покороче быть?*
*Ну, что ж!*
*В косметических витринах*
*Лучше куклы*
*Не найдешь!*
*(«За радяньські кадри», орган Киевского университета)*

# СЯБРЫ, РЫХТУЙЦЕСЯ ДА ФЕСТЫВАЛЮ!

**ЗВАРОТ**

**Цэнтральнага Камітэта ВЛКСМ і Антыфашысцкага камітэта савецкай моладзі да юнакоў і дзяўчат Савецкага Саюза**

Дарагія сябры, таварышы!

Летам 1957 года ў сталіцы нашай Радзімы—Маскве адбудзецца VI Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў «За мір і дружбу».

Пяць разоў ужо ўзвіваўся ў неба флаг фестывалю. Прага.. Варшава... Берлін... Бухарэст... Варшава... Тут праходзілі хвалюючыя сустрэчы моладзі. Фестывалі садзейнічалі ўмацаванню і расшырэнню дружалюбных інтэрнацыянальных сувязей. Юнакі і дзяўчаты ўсіх частак свету, рознага колеру скуры і розных палітычных перакананняў дэманстравалі свае магутнае адзінства, непахісную рашучасць змагацца за мір і дружбу паміж народамі.

Склікаемы ў Маскве чарговы Сусветны фестываль з'явіцца буйнай падзеяй у жыцці маладога пакалення ўсіх краін, магутнай маніфестацыяй моладзі ў гонар міру і дружбы паміж народамі. Фестываль дазволіць яшчэ больш умацаваць узаемаразуменне паміж юнакамі і дзяўчатамі ўсяго свету, расшырыць сувязі савецкай моладзі з моладдзю іншых краін.

Правядзенне Сусветнага фестывалю ў Маскве ўскладае на савецкую моладзь сур'ёзную адказнасць і вялікія абавязкі. Мы заклікаем савецкіх юнакоў і дзяўчат дастойна сустрэць гэтае свята.

Савецкая моладзь ідзе насустрач Сусветнаму фестывалю, натхнёная грандыёзнай праграмай камуністычнага будаўніцтва ў нашай краіне, намечанай XX з'ездам Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Паспяховае выкананне шостага пяцігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі СССР паслужыць далейшаму росту эканамічнай магутнасці нашай дзяржавы, павышэнню дабрабыту савецкага народа, справе ўмацавання міру ва ўсім свеце.

Партыя выразіла надзею, што савецкая моладзь, верная сваім цудоўным традыцыям, прыме самы гарачы ўдзел у ажыццяўленні гістарычных рашэнняў XX з'езда. Савецкая моладзь апраўдае гэтую надзею. Быць у першай шарэнзе барацьбітоў за справу партыі—заўсёды было высокім гонарам і святым абавязкам камсамольцаў, усёй моладзі.

Юнакі і дзяўчаты! Сустракайце фестываль—свята юнацтва і міру—новымі працоўнымі перамогамі! Няхай мацней разгараецца сярод моладзі полымя сацыялістычнага спаборніцтва за паспяховае ажыццяўленне шостага пяцігадовага плана, за датэрміновае выкананне заданняў 1956 года. Вышэй прадукцыйнасць працы! Поспехі ў працы на карысць нашай сацыялістычнай Радзімы—лепшы паказчык падрыхтоўкі да фестывалю.

Фестываль у Маскве будзе святам мастацтва народаў свету, аглядам маладых талентаў. На мінулых фестывалях савецкая моладзь з поспехам паказала дасягненні савецкага мастацтва. Шматгранная праграма мастацкіх выступленняў і конкурсаў фестывалю абавязвае нас ужо цяпер пачаць неабходную падрыхтоўку.

Сусветнаму фестывалю будзе папярэднічаць Усесаюзны фестываль савецкай моладзі. Агляд маладых удзельнікаў мастацкай самадзейнасці пачнецца на прадпрыемствах, у калгасах, соўгасах, МТС, ва ўстановах і навучальных установах. Затым пройдуць раённыя, гарадскія, абласныя, краявыя і рэспубліканскія фестывалі. Закончыцца фестываль святам у Маскве. Гэта з'явіцца нібы адборачным конкурсам прадстаўнікоў савецкай моладзі на Сусветны фестываль. Толькі лепшыя з лепшых атрымаюць права выступаць у конкурсах і канцэртах VI Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў.

Юнакі і дзяўчаты! Развівайце мастацкую самадзейнасць, стварайце новыя хоры, аркестры, танцавальныя, драматычныя калектывы, ансамблі! Актыўна ўдзельнічайце ў будаўніцтве новых клубаў і дамоў культуры, добраўпарадкоўвайце гарады, рабочыя пасёлкі і вёскі, азяляняйце іх, разбівайце сады, скверы і паркі, высаджвайце кветкі.

На фестывалі ў Маскве адбудуцца III Міжнародныя спартыўныя ігры моладзі—буйнейшая падзея ў спартыўным жыцці 1957 года. У праграму гэтых ігр уваходзяць спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы, гімнастыцы, плаванню, веславанню, веласіпеду, валейболу, баскетболу, футболу, тэнісу і многіх іншых відах спорту. У дні папярэдніх фестываляў савецкія спартсмены з гонарам пранеслі сцяг савецкага спорту.

Юнакі і дзяўчаты! Адзначым падрыхтоўку да Сусветнага фестывалю далейшым развіццём масавай фізкультурнай работы, ростам дасягненняў савецкіх спартсменаў! Пабудуем новыя стадыёны, спартыўныя пляцоўкі, водныя базы! Правядзем масавыя фізкультурныя святы, спаборніцтвы, кросы, эстафеты, прабегі, шлюпачныя паходы!

Летам 1957 года з захаду і ўсходу, з поўначы і поўдня будуць з'язджацца ў Маскву ўдзельнікі Сусветнага фестывалю. Яны праедуць па нашай краіне тысячы кіламетраў. Цёпла і дружалюбна сустрэнем нашых гасцей на іх шляху. Увагай і клопатамі акружым пасланцоў блізкіх і далёкіх краін!

Нашы госці з-за рубяжа захочуць пазнаёміцца з жыццём савецкай моладзі, пагутарыць з савецкімі сябрамі аб іх сённяшніх справах, аб іх планах на будучае, наведаць гарады Савецкага Саюза, пабываць на заводах і фабрыках, у калгасах, машынна-трактарных станцыях, соўгасах, у навучальных установах, каб убачыць, як мы працуем на карысць сваёй Айчыны, на карысць міру. Пакажам нашым зарубежным равеснікам вынік натхнёнай творчай працы савецкага народа, чым багатая наша сацыялістычная Радзіма, чым ганарацца савецкія людзі.

Дарагія сябры! Нам прадстаіць многа вялікіх і разнастайных спраў. Не губляючы ні аднаго дня, за работу! Зробім усё, каб VI Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў быў яркім святам маладосці міру, мацнеючай дружбы маладога пакалення ўсіх краін.

Мы заклікаем вас абмеркаваць на сходах моладзі гэты Зварот і прадумаць, што зробяць юнакі і дзяўчаты кожнага прадпрыемства, калгаса, МТС, соўгаса, установы, навучальнай установы, рыхтуючыся да VI Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве.

**ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ ВЛКСМ**
**АНТЫФАШЫСЦКІ КАМІТЭТ САВЕЦКАЙ МОЛАДЗІ.**

# СТИХИ *О ЛЮБВИ* А. ХАРКЕВИЧА

## МОСКВИЧКА

*До неё—далеко-далече,*
*И прошло...*
*Много-много дней.*
*Но все так же,*
*Как в первый вечер,*
*Я не в силах забыть о ней..*
*... В зное парился*
*Полдень летний.*
*Млел на солнце*
*Манежный сквер.*
*Молодой двадцатидвухлетний,*
*Я впервые шел по Москве.*
*Как отчаянно*
*Билось сердце!*
*Скромный путник*
*Сельских дорог,*
*Я не мог*
*На Москву насмотреться,*
*Чуть не сбил*
*Прохожую с ног...*
*Возмущенно,*
*Вспыхнув, как спичка,*
*«Неуклюжих людей» браня,*
*На меня*
*Взглянула москвичка—*
*И осеклась,*
*Поняв меня.*

*Сколько длилось*
*Это смущенье,*
*Я не помню.*
*Минуту?*
*Час?*
*Или только одно мгновенье?*
*Но смущенье*
*Сблизило нас!*

*Я, очнувшись,*
*Сказал девчине,*
*Что с Москвой*
*Знаком не вполне,*

*Что прошу,*
*По этой причине,*
*Снисходительней*
*Быть ко мне.*

*И она в ответ*
*Улыбнулась:*
*—Что ж, прощаю...*
*На первый раз.*

*И навстречу ко мне*
*Метнулась*
*Голубою молнией глаз!*
*... А потом*
*Мы бродили вместе,*
*Предаваясь*
*Своим мечтам...*

*Я забыл*
*О скором отъезде*
*И что время б*
*Расстаться нам.*

*Может,*
*Так и ушел бы поезд*
*Без меня*
*В туманную даль*

*И увез бы,*
*Увез с собою*
*Растревоженных глаз печаль.*
*Может,*

*Было бы все иначе:*
*Солнце,*
*звёзды*
*и эти дни,—*
*Будь бы я*
*Не такой горячий*
*И с признанием...*
*Повремени!*
*Но слова набежали сами*
*Не ждала она*
*Их огня—*

*Заслонила лицо руками,*
*Убежала прочь от меня.*
*Унесла ее электричка...*
*В тот же вечер*

*Уехал и я...*
*«Где ж ты,*
*Где ж ты теперь,*
*Москвичка—*

*Окрылённая жизнь моя?*
*Я ищу*
*Тебя на рассвете*
*В стороне*

*Любимой Москвы,*
*Ты мне утренней зорькой*
*Светишь,*
*Улыбаясь из синевы!»*

## ХОЛОСТЯЦКИЕ РАЗДУМЬЯ

*Посвящается другу Павлу Мисько*

Я сегодня обдумывал
Новые строчки,
И в раздумье своем
Я зашел далеко:

Если кто на земле
И родился в сорочке,
Так уж это наверное—
Павел Мисько!
Поглядеть на него—
Не такая уж птица:
Ну, обычный студентик,
Как все мы, точь-в-точь...
А ведь надо суметь
Так удачно влюбиться,
Чтоб жениться
Как раз в новогоднюю ночь!

Не вчера ли еще
Я без тени смущенья
С ним делился мечтами
Один на один.

А теперь подойдешь—
И преклонишь колени:
Пред тобою не кто-нибудь,
А семьянин!

Неразлучный мой друг,
Он осанкой героя
Ранит честь холостяцкую
Мне глубоко...

...Видно, в жизни моей
Надо что-то устроить,
Чтоб и мне быть на уровне
Павла Мисько!

## ЛЮБИМОЙ

*Не сердчай, что стихи при случае*
*Я не только тебе пишу—*
*Всё равно ты самая лучшая,*
*Кем живу я и кем дышу.*
*Всё равно—даже сам я чувствую!—*
*В героине моей любой*
*Ты всегда незримо присутствуешь*
*Хоть какой-то одной чертой.*
*Дело здесь не в творческой зрелости,*
*Дело здесь, конечно, в ином:*

*Если б в сердце мое всмотрелась ты,*
*Ты б себя увидела в нем!*
*Не легко ведь замыслы смелые*
*Воплощать мне в жизнь одному..*
*А вдвоем—мы такое сделаем,*
*Что и вряд ли снилось кому!*
*Переборем любые трудности,*
*Свежий след оставим в пути,*
*Чтоб грядущей любви и юности*
*Было легче к счастью придти!*

## ПА СЛЯДАХ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ

### *„Не на сваім месцы“*

Пад такім загалоўкам у нашай газеце быў змешчаны артыкул, у якім крытыкаваліся нядбайныя адносіны да работы комуніста тав. Талстаробрава.

Сакратар партыйнага бюро адміністрацыйна - гаспадарчай часткі БДУ тав. Пасько паведаміў рэдакцыі, што артыкул быў абмеркаваны на партыйным бюро адміністрацыйна-гаспадарчай часткі. Бюро адзначыла, што факты, прыведзеныя ў артыкуле, правільныя. Тав. Талстаробраў у апошні час выправіў недахопы і працуе значна лепш.

### *„У абстаноўцы бескантрольнасці“*

У 4 нумары «Беларускага універсітэта» ў перадавым артыкуле пад такім загалоўкам крытыкавалася работа кафедры англійскай мовы. Загадчык кафедры тав. Дорскі імкнуўся даказаць, што артыкул не адпавядае сапраўднасці.

Для праверкі работы кафедры англійскай мовы парткомам БДУ была створана камісія, якая, праверыўшы работу кафедры, пацвердзіла факты, прыведзеныя ў артыкуле.

Партыйны камітэт БДУ указаў комуністу Дорскаму на няправільнае рэагаванне на крытыку і прапанаваў выправіць недахопы, якія мелі месца ў рабоце кафедры.

# ПАЛАЖЭННЕ АБ КОНКУРСЕ

## НА СТВАРЭННЕ ЛЕПШАЙ САТЫРЫЧНАЙ ПРАГРАМЫ-АГЛЯДУ „ПАГАВОРЫМ АБ САБЕ“

У сувязі з падрыхтоўкай да I Усесаюзнага фестывалю моладзі ва універсітэце праводзіцца конкурс на стварэнне лепшай сатырычнай праграмы-агляду «Пагаворым аб сабе».

Конкурс праводзіцца з мэтай стварэння добрай эстраднай сатырычнай праграмы для мастацкай самадзейнасці універсітэта, прыцягвання мясцовых сіл паэтаў, фельетаністаў, удзельнікаў самадзейнасці для работы ў галіне эстраднага сатырычнага жанру, для барацьбы з маючымі месца недахопамі шляхам прыцягнення ўвагі грамадскасці да гэтых недахопаў праз эстрадныя сатырычныя выступленні.

**ТЭРМІНЫ ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСА І ЎДЗЕЛ У ІМ**

Конкурс праводзіцца з 1 красавіка па 5 верасня 1956 года. У конкурсе могуць прыняць удзел усе жадаючыя.

**УМОВЫ ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСА**

Кожны, хто ўдзельнічае ў конкурсе, прадстаўляе ў конкурсную камісію не пазней 5 верасня 1956 г. экземпляр праграмы-агляду. Калі ў праграме выкарыстоўваюцца песні, то павінны быць указаны аўтары музыкі і тэкстаў песень.

Праграма агляду павінна складацца з 2-х аддзяленняў, кожнае па 45—50 мінут, і можа заключаць у сабе індывідуальны і парны канферанс, інтэрмедыі, сатырычныя і гумарыстычныя сцэнкі, характэрныя танцы, пляскі, жанравыя песні, сатырычныя песенкі і куплеты на знаёмыя матывы, прыпеўкі і г. д. У праграме могуць быць падвергнуты крытыцы недахопы ў рабоце калектыва універсітэта, а таксама характэрныя недахопы калектываў ВНУ наогул, недахопы ў рабоце гарадскіх арганізацый.

Праграма павінна улічваць магчымасці удзельнікаў мастацкай самадзейнасці універсітэта. Тэкст праграмы можа быць напісаны на беларускай або рускай мовах.

**ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ КОНКУРСА І ЎЗНАГАРОДА ЯГО ЎДЗЕЛЬНІКАЎ**

Для падвядзення вынікаў конкурса створана конкурсная камісія ў складзе: Малышаў А. Я. (старшыня), Абецэдарскі Л. С., Бабосаў Е. М., Волк А. А., Герасіменка Г. Г., Гутараў І. В., Марчанка Д., Пратасеня П. Ф., Старавойтаў В. І.

Вынікі конкурса павінны быць падведзены не пазней 10 верасня 1956 года.

За лепшыя праграмы сатырычнага агляду ўстаноўлены грашовыя прэміі:

Першая прэмія—1.000 рублёў.
Другая прэмія—500 рублёў.
Трэцяя прэмія — 300 рублёў.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, пакой 62, тэл. 2-07-19
АТ 02973. Друкарня выдавецтва БДУ. Зак. 468. Тыраж 2000 Рэдактар А. ВОЛК.